**М. С. Дударонак,**
педагог-арганізатар вышэйшай катэгорыі

## Збор дружыны «Памяць болем прарасла»

**Мэта:** ушанаванне памяці юных герояў-антыфашыстаў, воінаў і партызан, якія змагаліся ў гады Вялікай Айчыннай вайны з ворагам.

**Задачы:**

- расшыраць, сістэматызаваць уяўленні дзяцей аб гісторыі вёскі Празарокі;
- актуалізаваць веды аб гераічных учынках герояў-антыфашыстаў, герояў вайны, якія загінулі пры вызваленні нашай вёскі, ветэранаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, што пражывалі ў вёсцы Празарокі, ушанаваць памяць аб іх мінутай маўчання.
- выхоўваць жаданне дапамагаць адзінокім людзям, вязням канцлагераў, даглядаць за Брацкімі могілкамі і месцам захавання яўрэяў, якія былі знішчаны ў гады ВАВ.
- выхоўваць пачуццё павагі, патрыятызму, грамадзянскасці.

**Абсталяванне:** ноутбук, запіс Дзяржаўнага Гімна РБ, «Летапіс вёскі Празарокі», лісткі з назвай збора і старонак збора для афармлення класа, кветкі для гасцей, мультымедыйная прэзентацыя.

**Падрыхтоўчая работа:** атрады на працягу тыдня рыхтавалі матэрыял да выступленняў на тэмы: «8 лютага – Дзень юнага героя-антыфашыста», «Вайна ў Празароках», «Вызваленне Празарок»; запрасілі на збор дружыны вязня канцлагера Т. У. Дударонак.

### Ход збора дружыны

I. Пастраенне атрадаў

II. Здача рапартаў

III. Вынас знамені піянерскай дружыны

IV. Выкананне Дзяржаўнага Гімна Рэспублікі Беларусь

V. Падвядзенне вынікаў рашэння мінулага збора дружыны

VI. Асноўны этап збора дружыны

**Старшая піянерважатая.** Чалавечая памяць – дзіўная. Часам мы ведаем то, чаго ніколі не бачылі.

**ССД.** Хтосьці сказаў: «Чалавек да тых пор чалавек, пакуль помніць». Сёння мы вяртаемся ў далёкі час саракавых.

**Старшая піянерважатая.** Мы ўспамінаем подзвіг воінаў і партызан Беларусі, усяго беларускага народа, які абараняў краіну ад ворага. І наш піянерскі збор дружыны ў іх гонар.

**ССД.** 8 лютага – незвычайны дзень для ўсіх піянераў – Дню юнага героя-антыфашыста спаўняецца 50 год. Піянеры атрада імя Зіны Партновай раскажуць нам аб гэтым дні. Памяці юных хлопчыкаў і дзяўчынак усіх краін свету, тым хто змагаўся і гінуў за свабоду, рэвалюцыю і шчасце людзей прысвячаецца гэты дзень.

8 лютага 1962 года ў Парыжы ў час дэманстрацыі працоўных, якія патрабавалі спыніць вайну ў Алжыры, праварадзікаламі быў забіты французскі школьнік юны патрыёт Даніэль Феры. А праз год у гэты ж дзень у засценках багдацкай турмы быў замучаны член антыфашысцкага руху ў Іраку 15-гадовы Фадыл Джамал.

Дзень юнага героя-антыфашыста адзначаецца ў свеце з 1964 года. Так здарылася, што ў гэты дзень былі расстраляны пяць хлопчыкаў-парыжан ліцэя «Бюфон», якія не здрадзілі сваім сябрам-падпольшчыкам у гады Другой сусветнай вайны. У гэты ж дзень былі расстраляны героі-маладагвардзейцы ў захопленым фашыстамі Краснадоне.

Юнымі героямі-антыфашыстамі сёння мы называем і піянераў-герояў, якія ў гады Вялікай Айчыннай вайны разам з дарослымі змагаліся на фронце, у партызанскіх атрадах, у акупацыі. Да вайны гэта былі самыя звычайныя хлопчыкі і дзяўчынкі. Вучыліся, дапамагалі старэйшым,

гулялі, бегалі. Іх імёны ведалі толькі родныя, аднакласнікі, сябры. Сёння імёны маленькіх герояў вялікай вайны ведаюць усе.

**Старшая піянерважатая.** Гэта Зіна Партнова

**ССД.** - Валя Коцік

**Старшая піянерважатая.** Лёня Голікаў

**ССД.** - Лара Міхеенка

**Старшая піянерважатая.** Марат Казей

**ССД.** - Галя Комлева

**Старшая піянерважатая.** Юта Бандароўская

**ССД.** - Саша Барадулін

**Старшая піянерважатая.** Віця Хаменка

**ССД.** - Віця Карабко

**Старшая піянерважатая.** Коля Гойшык.

Напад немцаў быў раптоўным. Савецкія людзі спадзяваліся на дагавор Гітлера са Сталіным, згодна з якім выключаўся напад Германіі на Савецкі Саюз. Але ўзброены вораг напаў і пачаў разбураць, забіваць, бамбіць.

**ССД.** Не абыйшла вайна і нашы Празарокі. Успомніць, як гэта было нам дапамогуць піянеры атрада імя Колі Гойшыка.

Ваенны смерч хутка набліжаўся да межаў Глыбоцкага раёна. У чацвер 3 ліпеня 1941 года, нямецкія войскі занялі горад Глыбокае. У гэты час праз вёску Празарокі ў напрамку горада Полацка адбываўся хаатычны рух нашых разрозненых часцей. Ішлі пераважна пешыя, без зброі. Жыхары нашай вёскі засталіся ў разгубленасці: мабілізацыя грамадзян прызыўнога ўзросту не праводзілася.

На наступны дзень на старой віленскай дарозе з боку Глыбокага паказаліся нямецкія матацыклісты, за імі ішлі аўтамашыны з нямецкімі салдатамі... У вёску немцы ўвайшлі без адзінага стрэлу.

З успамінаў Юльяна Антонавіча Сіняўскага, 1929 года нараджэння, жыхара вёскі Празарокі: «У час вайны наша сям' я жыла ў вёсцы Ксты,

якая знаходзіцца зусім блізка ля Празарок. У той дзень мы, вясковыя хлапчукі, пасвілі кароў. Дзесьці пад поўдзень прыбеглі нашы сябры і сказалі, што ў Празароках ужо немцы. Нам было вельмі цікава ведаць, што адбываецца ў вёсцы. Калі мы прыбеглі ў Празарокі, то ўбачылі, што немцы спыніліся ля хаты яўрэя Янкеля (размяшчалася насупраць сучаснага гандлёвага цэнтра). У Янкеля была вельмі багатая гандлёвая лаўка. Адзін з нямецкіх салдат кулямётнай чаргой збіў замок з дзвярэй лаўкі. Пачалося разграбленне... Тое ж самае зрабілі немцы і ў іншых яўрэйскіх крамах, якіх у Празароках была значная колькасць.

Пачаліся доўгія дні акупацыі».

У час акупацыі вёска Празарокі ўвайшла ў склад Глыбоцкай акругі рэйхкамісарыята «Остланд» з рэзідэнцыяй у Рызе. Цяжкія дні перажывалі мірныя жыхары, атмасфера страху, няўпэўненасці ў заўтрашнім дні рабіла адбітак на паводзіны людзей. Вёска нібы вымерла.

Першы дзень «новага парадку» запомніўся жыхарам тым, што ўсюды былі расклеены аб’явы і загады з папярэджаннем аб смяротным пакаранні ўсіх, хто будзе супраціўляцца ўладам.

У вёсцы размясціўся моцны нямецкі гарнізон з замаскіраванымі агнявымі кропкамі. Асноўныя сілы гарнізона размяшчаліся пры ўездзе ў вёску Празарокі па левым баку вуліцы Вакзальнай.

На вуліцы Літоўскай, у памяшканні польскай школы, немцы ўладкавалі канцылярыю. Гарнізон у Празароках быў вельмі шматлікі, фашысты надавалі ахове чыгункі асаблівую ўвагу. Тут жа, у Празароках, быў наладжаны збор прадуктаў харчавання для патрэб нямецкай арміі. Харчаванне павінны былі здаваць не толькі жыхары Празарок, а таксама і ўсіх навакольных вёсак. На ўсіх дарогах можна было бачыць шмат фурманак, якія везлі харчаванне ў Празарокі. З гэтай нагоды акупанты кругласутачна ахоўвалі не толькі чыгунку, але і шашу.

У 1942–1943 гадах па ўсёй тэрыторыі Празароцкага гарнізона праводзілася аперацыя па вывазу мясцовых жыхароў на працу ў Германію. У асноўным вывозілі моладзь. Усе, хто меў магчымасць, імкнуліся схавацца, тых жа, каму гэта не ўдавалася, камплектавалі групамі і пад канвоем адпраўлялі на станцыю Зябкі, адкуль быў наладжаны вываз у Германію.

**Старшая піянерважатая.** Беларусы – мірны народ, самы церпялівы сярод славян. Разлік на гэта рабілі захопнікі. Але пад Сталінінградам і Курскам згінулі апошнія надзеі ворага на перамогу ў вайне.

**ССД.** Вялікія страты панесла наша Радзіма ў той вайне: 9200 спаленых вёсак, разбураны амаль усе гарады, загінуў кожны чацвёрты жыхар Беларусі…

**Старшая піянерважатая:** Наша памяць баліць і зыходзіць крывёю, як рана, калі мы чуем гэтыя лічбы. Але Беларусь узнялася на барацьбу, і наш народ выстаяў у схватцы з жорсткім ворагам.

Вызваленне прыйшло і ў Празарокі. Аб ім раскажуць піянеры атрада імя Марата Казея.

28 чэрвеня 1944 года ў ходзе аперацыі «Багратыён» пад Віцебскам была знішчана групіроўка германскіх войск. Адразу ж пачалася Полацкая аперацыя Першага Прыбалтыйскага фронту (камандуючы І. К. Баграмян). Удары наносіліся па напрамках вакол моцна ўмацаванага Полацка. На паўднёвы захад ад Полацка ў напрамку Глыбокае – Казяны разгортвала наступленне 6 гвардзейская армія сумесна з 45 арміяй.

29 чэрвеня нашы войскі перарэзалі чыгунку Полацк – Маладзечна. У ноч з 29 на 30 чэрвеня адбылася паветраная бамбардзіроўка нямецкага гарнізона ў Празароках. Ужо было зразумела, што фашысты ў вёсцы пануюць апошнія дні. Яны ў спешцы знішчалі свае дакументы, вывозілі дабро, а 29 чэрвеня і самі пачалі ўцякаць у бок Глыбокага. 30 чэрвеня ў вёску Празарокі ўварваўся савецкі танкавы дэсант.

За вызваленне вёскі Празарокі ад фашыстаў аддалі свае жыцці П. А. Бураў, 1901 года нараджэння, палкоўнік 117 танкавай брыгады, Я. І .Зелянкоў, 1925 года нараджэння, сяржант механізаванай брыгады, З. А. Фаттахаў, 1911 года нараджэння, старшы сяржант, Р. В. Фядзюнін, 1925 года нараджэння, малодшы сяржант, І. Д. Ціхінскі, 1924 года нараджэння, Б. Х. Шуб, 1920 года нараджэння. Іх астанкі пакояцца ў Брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан у нашай вёсцы.

**Старшая піянерважатая.** Празароцкая зямля багата на ўдзельнікаў і ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. На жаль, сёння іх няма ўжо разам з намі, але мы памятаем іх імёны. Успомніце іх і вы. Севярын Сямён Сцяпанавіч

**ССД.** - Масько Андрэй Нікіфаравіч

**Старшая піянерважатая.** Лось Аляксей Аляксандравіч

**ССД.** - Сямчонак Аляксандр Аляксандравіч

**Старшая піянерважатая.** Хамёнак Часлаў Іосіфавіч

**ССД.** - Пажога Мечыслаў Антонавіч

**Старшая піянерважатая.** Гурскі Станіслаў Юльянавіч

**ССД.** - Варахоб Георгій Уладзіміравіч

**Старшая піянерважатая.** Саламянка Сямён Паўлавіч

**ССД.** - Саламянка Сцяпан Паўлавіч

**Старшая піянерважатая.** Канцыял Кацярына Іванаўна

**ССД.** Рэкун Фёдар Іванавіч

**Старшая піянерважатая.** Успомнім усіх паімённа,
Горам успомнім сваім.
Гэта патрэбна не мёртвым,
Гэта патрэбна жывым.

Памяць аб загінуўшых ушануем мінутай маўчання.

**Мінута маўчання. Гук метранома.**

**Старшая піянерважатая.** Акрамя таго, што нашых людзей забівалі, адпраўлялі працаваць у Германію, былі і такія, якія ўсе жудасці вайны пазналі ў канцлагерах. Сёння на зборы дружыны прысутнічае малалетні вязень канцлагера Дударонак Таццяна Уладзіміраўна. Паважаная Таццяна Уладзіміраўна, мы ведаем, што ўспамінаць пра той час вам цяжка, але просім вас расказаць аб перажытым.

Выступленне Дударонак Таццяны Уладзіміраўны

**ССД.** Давайце ж будзем удзячнымі нашчадкамі і захаваем памяць аб вызваліцелях!

**Старшая піянерважатая.** Ва ўсе часы вучні школы займаліся пошукавай работай, даглядалі за помнікам, сустракаліся з ветэранамі, запрашалі іх на святы, аказвалі шэфскую дапамогу. Аб гэтым сведчаць фотаздымкі і дакументальныя матэрыялы. Вось, напрыклад, перад вамі дакументальныя сведкі 1970-га года. Запросы піянераў 4,5 класаў у Глыбоцкі Райваенкамат з просьбай прадаставіць дадзеныя аб маёры Ложнікаве і палкоўніку Леонаве і адказы на іх.

**ССД.** А гэта сустрэча ў час мітынга, прысвечанага Дню Перамогі, з Фёдарам Іванавічам Маркушыным. Ён дзеліцца з вучнямі адрасамі баявых таварышаў.

**Старшая піянерважатая.** Ветэран Вялікай Айчыннай вайны, былы дырэктар Празароцкай сярэдняй школы Севярын Сямён Сцяпанавіч у час сустрэчы з піянерамі.

**VII. Прыняцце праекта пастановы піянерскага збора дружыны**

**Старшая піянерважатая.**

1. Працягваць шэфства над вязнямі канцлагераў, адзінокімі людзьмі, настаўнікамі-ветэранамі працы.Тэрмін выканання: пастаянна, адказныя: усе піянеры. Кантроль за выкананнем ускласці на ССД Парфяновіч Валянціну.

2. Прыбіраць тэрыторыю Брацкіх могілак, месца захавання яўрэяў.

Тэрмін выканання: пастаянна, адказныя: саветы атрадаў, адказныя за працоўныя справы. Кантроль за выкананнем ускласці на намесніка ССД Аўласёнак Дар'ю.

3. Сабраць успаміны ветэранаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, зрабіць электронны варыянт успамінаў, даслаць успаміны для стварэння памятнага фотаальбома у Цэнтр дзяцей і моладзі. Тэрмін выканання: да 1 сакавіка 2014 года, адказныя: члены рэдкалегіі пад кіраўніцтвам Яркевіча А.

4. Сістэматызаваць інфармацыю аб Брацкіх могілках вёскі Празарокі і даслаць яе для стварэння фотакаталога у Цэнтр дзяцей і моладзі. Тэрмін выканання: да 20 лютага 2014 года, адказная: Парфяновіч В.

5. Пасадзіць «Алею памяці» з дэкаратыўных кустарнікаў ля параднага ўезда ў школу. Тэрмін выканання: красавік – май 2014 года, адказныя: эколагі піянерскіх атрадаў, кантроль за выкананнем ускласці на эколага дружыны Мядзельца Яўгенія.

Галасаванне: за – … , супраць – … , устрымаліся – … .

**VIII. Пастраенне атрадаў на лінейку**

**Старшыня савета дружыны.** Дружына, пад знамя піянерскай дружыны імя Ігната Буйніцкага – смірна! Знамя вынесці!

**IX. Вынас знамені**

**Старшая піянерважатая.** Піянер! Да спраў на карысць Радзімы, за дабро і справядлівасць, будзь гатовы!

**Піянеры.** Заўжды гатовы!